Дзяржаўная ўстанова адукацыі ”Какоўчынская яслі-сад-сярэдняя школа Сенненскага раена“ Віцебскай вобласці

# ”Беларускі абрус“

Раённы  этап рэспубліканскага конкурса ”Экспанат для музея“
Намінацыя ”Таямніца ў рэчах“ (рэчавы музейны прадмет).

Пасік Аліна, 7 клас
Скурко Ангеліна, 7 клас
Кіраўнікі: Пупіна Тамара Васільеўна,
Баравік Людміла Віктараўна
+375 33 679 26 99

Амаль у кожным музеі створаны краязнаўчыя куткі, дзе сабраны краязнаўчыя матэрыялы па гісторыі весак, калгасаў, матэрыялы аб ветэранах Вялікай Айчыннай вайны, перадавіках сельскай гаспадаркі. Тут сабраны старынныя прылады працы, рушнікі, пасцілкі, нацыянальнае адзенне і інш. Сабраныя матэрыялы выкарыстоўваюцца пры правядзенні масавых мерапрыемстваў. Адным з экспанатаў музейнага пакоя Какоўчынскай яслі-сад-сярэдняй школы Сенненскага раена пад нумарам з'яўляецца ільняны абрус, інвентарны № КП-30. Акт прыёму ад 24.09.2019, захаванасць здавальняючая. Абрус (настольнік) – палатняны, тканы выраб, прызначаны для засцілання стала. Лакальная назва скацерка. Памер 170x100 см.

Не дарэмна вёска наша цэніцца,
Шчырасцю – гасцінны беларус.
На парозе толькі госць павернецца -
Ільняны разгортваем абрус…

Ніна Аксёнчык

У музейны пакой абрус трапіў пасля удзелу навучэнцаў у рэспубліканскай акцыі ”Я гэты край Радзімаю заву“. У 2019 годзе вучні школы завіталі у госці да жыхаркі аг. Какоўчына Баравік Валянціны Трафімаўны, у час гутаркі Валянціна Трафімаўна расказала пра тое, як у гады вайны хацелася розных прысмакаў. У час вайны ей іспоўнілася 7 год, і яна добра памятала, як не было цукру, якім смачным і духмяным казаўся хлеб, які выпякалі дабаўляючы туды шчаўлюк, крапіву, цертае лушпінне бульбы, нават апілкі. Валянціна Трафімаўна апавядала пра тое, як беражліва адносіліся да дамашняга скарбу у гады вайны. Баючыся, што могуць у любы момант награнуць фашысты або народнікі (а яны забіралі усе падчастую) маці, Батаўская Еўфрасіння Міхайлаўна, усе больш-менш каштоўнае закапала ў вялікай дзежцы пад яблыняй. Абрусы, рушнікі, адзенне, посуд, кнігі старэйшых сыноў. У хаце пакінула толькі самае неабходнае. Вось гэты самы ільняны абрус праляжаў усю вайну ў дзежцы, чакаючы свайго часу.

Дачакаўчыся свайго часу на абрус ставілі велікодныя стравы, ен захоўваўся ў недатыкальнасці на працягу ўсяго года. Абрус, згодна з народнымі вераваннямі, ахоўваў ад граду, і таму пры з'яўленні градавых хмар гэты абрус рассцілалі на двары. ... Усе апраналіся ў святочнае адзенне, бралі з сабой ільняны абрус, велікодныя яйкі, бліны, каўбасу, сала, свянцоную соль, складвалі ўсё гэта ў хусцінку і адпраўляліся ў царкву на абедню. Ільняныя абрусы і ручнікі ў беларусаў перадаюцца звычайна з пакалення ў пакаленне, і што традыцыя беражлівых адносін да ільняных вырабаў захоўваецца ў кожнай сям'і. Ён служыў знакам дабрабыту і багацця ў хаце. Абрусы выраблялiся з ільнянога палатна, складаліся з дзвюх полак, злучаных паміж сабой вязанымі карункамі, на канцах упрыгожваліся махрой. Амаль на кожнае свята на стол рассцілалі чысты абрус. Напрыклад, на Каляды. Стол выкладалі сенам. Потым засцілалі белым абрусам. І ўжо тады выкладалі на

яго стравы. А ў шматлікіх песнях стол і абрус сімвалізуюць нашу беларускую гасціннасць.

Абрус пераЖЫЎ і свайго майстра, і сваю першую гаспадыню, Батаўскую Еуфрасінню Міхайлаўну, якая ў весцы была першая лекарка не толькі ў гады вайны, а і пасля яе. Ніводнае вяселле, нараджэнне дзіцяці, ці пахаванне не абыходзілася без яе, бо лічылася яна і першай кухаркай на весцы. А яшчэ была выдатным майстрам па вышыванцы, ды па ткацтву. Ніхто лепш за яе не мого справіцца з ткацкім станком, бо каб правільна на ім працаваць, рабіць прывабную тканіну, трэба было сапраднае майстэрства.

Даведаўшыся, што ў школе есць музейны пакой, Валянціна Трафімаўна перадала ільняны абрус вучням. Вывучая гісторыю паходжання абруса, мы даведаліся, што абрус, настольнік, настольніца, стальніца, сурвэта — тканы выраб, якім засцілаюць стол. Меў побытавае, святочнае, сімвалічнае значэнне, абавязкова ўваходзіў у пасаг нявесты. Найбольш, на беларускіх землях, вядомы белы колер абрусаў. У многім стыль абруса блізкі да ручніка, суадносіцца і з народнымі строямі. Абрус выконвае некалькі функцый: абараняе дарагую (з каштоўных парод дрэва, мармуру) паверхню стала ад забруджванняў і пашкоджанняў; прыкрывае дэфекты паверхні стала; з'яўляецца элементам дэкору памяшкання.

Падарунак як напамін пра тое, што кожная беларуская сям'я мела свой побыт, мела мірнае жыцце, а лен, як спрадвечны сябар беларусаў, нес чысціню і пакой не толькі ў хату, але і ў душы людзей.

Жыццё бяжыць, мяняецца час, на змену адной навізне прыходзіць другая, трэцяя… І гэты рух нам не спыніць, як не спыніць і самога бегу часу. Але штосьці застаецца – вечнае, патрэбнае хоць аднаму чалавеку, як напамін аб былым, прынясе людзям радасць і задавальненне.

